

*На **Радаўніцу** на могілках у в. Белая Сарока Нараўлянскага раёна. 1994.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**РА́ДАЎНІЦА**, Радуніца, Радуніцкія Дзяды, язычніцкае веснавое свята ўсходніх славян, звязанае з *культам продкаў*; дзень памінання памерлых. Адзначаецца на 9-ы дзень пасля *Вялікадня*. Паходжанне слова «Р.»

выводзяць ад розных слоў: ад ведыйскага radanh (ахвярадаўства), літоўскага rauda (галашэнне), ад агульнаславянскіх слоў «род», «радзіцца», «радава́цца», ад імя міфічнага бога Рады і г.д. На Р. кожная сям'я памінала родзічаў спачатку ў царкве, а потым на могілках, дзе прыводзілі ў парадак магілы блізкіх. На насыпе рассцілалі абрус і пачыналі памінальную трапезу, якая нагадвала старажытную язычніцкую трызну. Крыху стравы (фарбаваныя яйкі, куццю, мяса і інш.) і гарэлкі пакідалі «для мёртвых», рэшту раздавалі жабракам. У размовах успаміналі нябожчыкаў, часта гучалі галашэнні. Згодна з нар. прыказкай, «на Р. да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а ўвечары скачуць», правядзенне Р. заканчвалася застоллем дома ці ў карчме. У некаторых месцах Палесся Р. замянілася т.зв. *Наўскім Вялікаднем*, які адбываўся ў чацвер велікоднага тыдня. На ўсходзе Беларусі функцыю Р. выконвалі летнія — Траецкія, ці Сёмушныя — *Дзяды*. З днём правядзення Р. звязвалі разнастайныя нар. назіранні і павер'і. Калі яе прыход супадаў з маладзіком — чакалі добрага ўраджаю; калі ж месяц быў у апошняй квадры — прадказвалі няшчымніцу. На Р., звязаную з культам нябожчыкаў, не пажадана было нічога садзіць і сеяць. Правядзенне абрадавых рытуалаў на Р. калісьці было накіравана на тое, каб задобрыць душы продкаў, заслужыць іх спрыянне ў жыцці і гаспадарцы. Шырока існуе і цяпер як ушанаванне памяці памерлых.

*Літ.*: Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.

*У. А. Васілевіч.*





*Перад* ***Радаўніцай*** *на могілках у в. Дронькі Хойніцкага раёна. 2004.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ